Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага мастацтва

Кафедра беларускай народна-песеннай творчасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай
___________Л.Л. Ражкова
___ ____________20___ г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________І.М. Грамовіч
___ ____________20___ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ПАСТАНОЎКА ГОЛАСУ

для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць,
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка),
спецыялізацыі 1-18 01 01-01 02 Харавая музыка (народная)

Складальнікі:
Снапкова Ларыса Віктараўна
Раманенкава Вераніка Іванаўна

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 17.11.2017 г.
пратакол № 3

Складальнікі:

*СНАПКОВА Л.В., дацэнт кафедры белорускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;*

*РАМАНЕНКАВА В.І., выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.*

Рэцэнзенты:

*Кафедра міжкультурнай камунікацыі прыватнай ўстановы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава»;*

*Шэдава А.В., загадчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў».*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці*
*(пратакол ад 16.05.2017 № 10);*

*Саветам факультэта музычнага мастацтва*
*(пратакол ад 29.05.2017 № 9)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА …………………………………......... 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………………….. 6
2.1 Народная спеўная культура ...………………...……………… .. 6
2.2 Вакальна-тэхнічныя навыкі …………………………….......... 10

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………… 12
3.1 План правядзення заняткаў па дысцыпліне ……………………….. 12
3.2 Распяванне ……………………………..……............................... 13
3.3 План анатацыі на вакальны твор…………………………………… 15

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ……………………………….... 18
4.1 Патрабаванні да экзаменаў і залікаў па дысцыпліне………………… 18
4.2 Пытанні да самастойнай працы студэнтаў…………………………….. 19
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў……………... 20

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………......................... 23
5.1 Тэматычны план курса 23
5.2 Метадычныя рэкамендацыі па авалоданні народнай манерай спеваў.. 26
5.3 Асноўная літаратура…………………………………………………….. 30
5.4 Вучэбна-метадычная літаратура ……………………………………….. 30
5.5 Дадатковая літаратура …………………………………………………….. 31

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Пастаноўка голасу” займае важнае месца ў вучэбным працэсе па падрыхтоўцы кіраўнікоў фальклорных калектываў. Гэта адна з галоўных прафіліруючых дысцыплін, засваенне якой дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста.

Кіраўнік фальклорнага калектыву павінен валодаць народнай манерай спеваў, ведаць методыку навучання народнай манеры спеваў удзельнікаў аматарскіх калектываў, творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці – захаванню, развіццю і прапагандзе прагрэсіўных традыцый народнапесеннага выканальніцтва, садзейнічаць павышэнню ўзроўня песенна-выканальніцкага майстэрства фальклорных калектываў і асобных выканаўцаў.

Практычнае знаёмства студэнта з народнай манерай спеваў пачынаецца з выпрацоўкі навыкаў песеннага дыхання, апоры гуку, дыкцыі і атакі гука, авалодання правільным гукаўтварэннем на вакальных практыкаваннях і творах.

Вялікая ўвага ў вакальным навучанні надаецца рабоце над засваеннем песеннага фальклора ўсіх рэгіёнаў Беларусі.

Мэта вучэбнай дысціпліны “Пастаноўка голасу” – даць будучаму спецыялісту неабходныяведы па авалоданню народнай манерай спеваў, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

Асноўныя задачы курса:

– вывучэнне тэхнікі спеваў, якая накіравана на прастату, натуральнасць і характарнасць спеваў, інструментальную роўнасць гучання голасу, выразна-асэнсаванае гукаўтварэнне праз інтанацыйна-сэнсавы пасыл, які раскрывае агульны змест твора;

– развіццё артыстычных дадзеных праз разуменне драматургіі народнай песні;

– выхаванне музычна-выканальніцкага і мастацкага густу на лепшых узорах народнай аматарскай творчасці і на падставе вывучэння вопыту выдатных майстроў народных спеваў, спевакоў акадэмічнай школы.

Народная выканальніцкая школа садзейнічае:

– набыццю практычных навыкаў сольных спеваў у беларускай народнай манеры выканання;

– авалоданню вакальнай тэхнікай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– набыццю акцёрскага і выканальніцкага майстэрства і мастацкага ўвасаблення песні;

– выхаванне музычна-выканальніцкай культуры і мастацкага густу, разуменню драматургіі народнай песні.

Пасля вывучэння курса выпускнік павінен ведаць:

– спецыфіку народнага голасу;

– народна-выканальніцкія прыёмы;

– прафесійнае вырашэнне пытанняў тэхналогіі засваення ў народнай манеры спеваў;

– стылёвыя асаблівасці народнай песні розных рэгіёнаў Беларусі;

– каляндарна-абрадавы песенны цыкл Беларусі.

Пасля вывучэння курса выпускнік павінен умець:

– самастойна вывучаць і змястоўна данесці да слухача народны твор;

– свабодна валодаць народнай манерай спеваў;

– выканваць творы з суправаджэннем і без інструментальнага суправаджэння;

– валодаць прынцыпамі падбору рэпертуару;

– з акцёрскім майстэрствам перадаць сэнс выконваемага твора;

– валодаць нюансіроўкай і фразіроўкай.

Асноўныя формы засваення вучэбнага матэрыялу – індывідуальныя заняткі. На засваенне курса адведзена 360 гадзін, з якіх 150 – аўдыторныя. Заняткі праводзяцца на працягу пяці курсаў, пасля кожнага здаюцца экзамены ці залікі.

Самастойная работа па засваенню курса прадугледжвае разбор і завучванне музычнага і паэтычнага тэксту; пастаяннае наведваннне канцэртаў і рэпетыцый аматарскіх і прафесійных фальклорных калектываў, праслухоўванне фоназапісаў лепшых выканаўцаў народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Народная спеўная культура

Сучасны выканаўца народных песень павінен быць рознабакова адукаваным чалавекам, музычна і мастацка развітым, добра разбіраюцца ў праблемах мастацтва, дасведчаным і чалавекам, які глыбока разумее фальклор і працэсы развіцця народнай творчасці. Што з'яўляецца неабходным для выканання разнастайнай прафесійнай пеўчай праці ў традыцыйным фальклорным напрамку, акадэмічным (народным) напрамку, у сольнай выканальніцкай дзейнасці на канцэртнай эстрадзе.

Адпаведна, галоўнай задачай на пачатковым этапе навучання спевам з'яўляецца фізічнае развіццё голаса на аснове трэніроўкі органаў дыхання і асэнсавання законаў акустыкі, засваенне і практычнае замацаванне правільнай пеўчай ўстаноўкі, выпрацоўкі асноўных пеўчых навыкаў і авалодання спосабам адкрытага гукаўтварэння ў высокай пеўчай пазіцыі пры мяккай атацы гуку.

Акрамя працы над тэхнікай спеваў і асноўнымі навыкамі гуказдабывання студэнту неабходна авлодаць спецыфікай народных элементаў спеваў: адкрыты спосаб гукаўтварэння, інтэнсіўнае грудное рэзаніраванне, натуральнае вібрата, а самае галоўнае – размоўная манера інтанавання.

У працэсе развіцця пеўчага (вакальнага) мастацтва склаліся тры асноўных народна-пеўчыя культуры: традыцыйная (дыялектная) пеўчая культура, класічная (акадэмічная) народная культура, стылізаваная народная пеўчая культура.

Усе сродкі мастацкай выразнасці песень **традыцыйнай культуры** шмат у чым абумоўлены двума асноўнымі фактарамі – рэгіянальна-стылявы (гісторыка-генетычны) і жанравы. Гэту разнастайнасць рэгіянальных стыляў і пеўчых жанраў неабходна ўлічваць у працэсе навучання па вакальным дысцыплінах.

<u>Рэгіянальна-стылявыя асаблівасці народнай песні</u>.

Выканаўца песень традыцыйнай культуры павінен разумець і ведаць, што традыцыйныя спевы, як вядома, існуюць толькі ў канкрэтных дыялектах. Пры гэтым кожная пеўчая традыцыя паводле сваіх няпісаных, але стойкіх законах мае сваю колькасць песенных жанраў, сваю эмпірычную класіфікацыю песеннага матэрыялу, якая суправаджаецца спецыяльнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрміналогіяй, вар'іруемыя дыялекты, свой пеўчы стыль, дыялектную фанетыка, лексіку і сінтаксіс, дыялектныя рысы напеву.

Ідэальнай умовай навучання з'яўляюцца жывыя зносіны студэнтаў з дыялектным асяроддзем, у якім існуе тая ці іншая песня. Калі ж няма такой магчымасці, неабходна арганізаваць шматразовае праслухоўванне дыялектных фоназапісаў. Грэбаваць дыялектным спевам азначае пазбаўляць народныя спевы істотнай прыкметы – характарнасці. Адсюль выцякае сур'ёзная педагагічная праблема – выхаванне спевакоў, здольных перадаваць спецыфічныя асаблівасці музычна-паэтычнай мовы канкрэтных мясцовасцяў Беларусі. Да гэтых асаблівасцяў адносяцца спецыфічныя прыёмы выразнасці ў народным спеве: «гуканне», глісандзіраванне, «ахі», «охі», агаласоўкі зычных, мелізматыка (кароткі і двайны фаршлагі, просты мардэнт), скаты, слізганне галасоў, прыёмы марката (скандыраванне), пульсавання («уздрыгванняў»), «раскачванне» гуку. Кожны дыялект мае сваю артыкуляцыйную базу ў выглядзе комплексу артыкуляцыйных звычак – «акцэнту» мовы. Гэта артыкуляцыйная база ўключае ў сваё паказчыкі: становішча гартані, вуснаў, мовы, мяккага неба, раскрыцця рота (сківічнага кута) і інш.

Наступны фактар – <u>жанравая спецыфіка народнай песні</u>.

Для разумення вобразнага зместу твораў народнай музыкі і іх ролі ў жыцці народа неабходна ведаць іх жанравую прыроду. Жанравая прырода песні складвалася дзякуючы некалькім фактарам: абставінам, пры якіх яна выконвалася (падчас абраду, жыццёвай сітуацыі і г.д.); моўнаму зместу і музычнай структуры; сацыяльнай прыналежнасці. Адпаведна кожнаму народна-песеннага жанру патрабуецца свой рэжым пеўчай фанацыі, свае выканальніцкія прыёмы. Напрыклад, асаблівасці артыкуляцыі, пеўчага дыхання, спосабы выканання, якасць гуку.

Мастацка-вобразны строй народнага песнятворчасці для аўтэнтычных выканаўцаў з'яўляецца жыццёвай рэальнасцю, якой прасякнута іх свядомасць

**Класічная (акадэмічная) народная спеўная культура**

Класічная (акадэмічная) народная манера спеваў мае шэраг адметных асаблівасцяў як у гукаўтварэння, так і ў размяшчэнні артыкуляцыйных формаў. Гэтай манеры спеваў уласцівы лёгкі "зявок" пры гукаўтварэнні, прыўзняты мяккае неба, адносна акругленыя галосныя. Гук ўзмацняецца за кошт вакальна-дыхальнага падсвязачнага ціску ў момант рэзанансу з максімальным выяўленнем акустычнай магчымасці галасавога апарата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Максімальна прыўзнятае мяккае нёба і маленькі язычок даюць магчымасць акругліць ротавую поласць, апусціць ніжнюю сківіцу, корань языка. Корань языка павінен быць апушчаны як мага ніжэй. Пазіцыя рота і кораня языка змяняецца ў залежнасці ад вымаўленчых нормаў галосных і зычных.

Тэхнічныя формы гукаўтварэння класічнай народнай манеры спеваў маюць вялікі дыяпазон магчымасці ў падборы мастацка-выканальніцкага рэпертуару. Народна-песенны фальклор – гэта яснасць выразнасці перадачы слова. Дыкцыя павінна быць выразнай, звязанай з мовай і фанетыка гутарковай мовы, яркасцю, звонкасцю «блізкага» гуку вымаўленчых нормаў галосных. Асноўнымі рэзанатарамі народнай манеры спеваў з’яўляюцца: грудзі, поласць роту, цвёрдае нёба, зубы. Разам з тым спевакі павінны свабодна пераходзяць з аднаго рэгістра ў другі, не абмяжоўваючы дыяпазон мастацкага твораў. Акрамя таго, творы, якія ўключаюць у сябе элементы руху рук, галавы, ног, ўносяць у выканальніцкую народную манеру спеваў рысы сапраўднай народнасці, жанравай своеасаблівасці

**Стылізаваная народная пеўчая культура**

Стылізаваная народная пеўчая культура заснавана на творах аўтынтычнага фальклору, але выступае ў новай перапрацаванай форме. Перапрацоўка датычыць як манеры выканання так і непасрэдна музычнага матэрыялу.

Тэрмін “стылізацыя” тлумачыцца  як аднаўленне, узнаўленне істотных рыс стылю пісьменніка, мастацкага напрамку, літаратурнай плыні, спецыфічных асаблівасцей музыкі. Фальклорны стыль уяўляе сабой сістэму “сродкаў поліэлементнай вобразнасці”, гэта значыць усіх выяўленчых сродкаў мовы, музыкі, пластыкі ў іх узаемасувязях, узаемадзейнасці або ў іншых адносінах.

З канца XX стагоддзя пачалі ўзнікаць стылізаваныя і эксперыментальныя фальклорныя калектывы, якія:

• адраджаюць і асвойваюць жанры традыцыйнага фальклору;

• дзейнічаюць на сцэнічных пляцоўках розных фестываляў, канцэртаў;

• узнаўляюць сапраўдныя дыялектныя стылі фальклору;

• не капіруюць аўтэнтычны фальклор, а спасцігаюць і асэнсоўваюць мастацкі прататып сучасным метадам аналізу, пераапрацоўкі і інтэрпрэтацыі;

• эксперыментуюць у вобласці спалучэння народных традыцый з сучаснымі музычнымі і песеннымі кірункамі.

Удзельнікі такіх калектываў не з’яўляюцца носьбітамі пэўнай лакальнай традыцыі. Яны маюць разнастайную музычную адукацыю і засвойваюць рэпертуар у працэсе працы з традыцыйнымі творамі мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сваёй аснове такія калектывы – гарадскія гурты, якія прытрымліваюцца разнастайных стыляў аранжыраванага фальклору: фольк-рок, фольк-мадэрн, індзі-фольк, неафольк, фольк-прагрэсіў, фольк-метал, этна-фьюжан, этна-джаз і інш.

Першыя спробы падобнага сінтэзу фальклора былі зроблены вакальна-інструментальным ансамблем «Песняры» пад кіраўніцтвам У. Мулявіна (1969 г.). У сваіх апрацоўках ансамбль выкарыстоўваў шасці- васьмігалоссе, электроннае музычнае гучанне. Далейшым развіццём пераапрацоўкі і адаптацыі народных песень пачалі займацца: «Палац», стыль – фольк-рок, фольк-модерн, заснаваны ў 1992 г.; Этна-трыа «Троіца», стыль – world-music, 1995 г.; «Крыві», стыль – арт-мадэрн-фольк, 1997 г.; «Юр'я», стыль – этна-мадэрн, 1999 г.; «Бан-жвірба», стыль – фольк-рок, 1999 г.; «Osimira», стыль – world-music, этна-шоў, 2002 г.;  «Akana-NHS», стыль – этна-джаз, 2003 г.

Народная музыка таксама непарыўна звязана з абрадавым дзеяннем, харэаграфічным рухам. Карысна пазнаёміцца з нацыянальнымі касцюмамі аўтэнтычных выканаўцаў, пластыкай руху, манерай паводзінаў і г.д. Усё гэта важна для прафесійнай падрыхтоўкі выканаўцы народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 Вакальна-тэхнічныя навыкі

Навык пеўчага дыхання – гэта ўменне тэхнічна правільна арганізаваць пеўчы ўдых і выдых, што з'яўляецца асновай дакладнай каардынацыі працы ўсяго галасавога апарата.

У працэсе ўтварэння гуку галасавы апарат (ГА) працуе як узаемазвязаная адзіная сістэма. Усе яго часткі: дыханне, горла, артыкуляцыйны апарат ўплываюць адзін на аднаго.

Таму асноўным крытэрыем авалодання навыкам пеўчага дыхання з'яўляецца тэхнічна правільны гукавы вынік.

Практычна гэты навык мае на ўвазе ўменне размяркоўваць дыхальны запас паветра на ўсім працягу музычнай фразы, уменне эканомна яго расходаваць. Асноўная перавага аддаецца ніжнероберна-дыяфрагмальнаму або так званаму брушному віду дыхання.

Навык пеўчага дыхання патрабуе ад студэнта ўмення аналізаваць свае дыхальныя адчуванні падчас спеваў. У працэсе авалодання гэтым навыкам навучэнец набывае магчымасць:

- Асвоіць і прымяніць на практыцы адчуванне пеўчай апоры, якая здымае мышачную стомленасць і выхоўвае агульную вынослівасць ГА;
- Знаходзіць правільную каардынацыю ГА;
- Выпрацоўваць патрэбны характар змыкання галасавых звязак;
- Кантраляваць правільнасць гукаўтварэння па сваіх дыхальных адчуваннях.

Навык пеўчага дыхання дазваляе студэнту авалодаць здольнасцю асэнсавана і падкантрольна кіраваць працай усяго ГА у працэсе спеваў.

Тэхнічна правільна арганізаваная <u>праца гартані</u> – адна з асноўных складнікаў пеўчага працэсу. Авалоданне навыкамі правільнай арганізацыі яе работы – заклад прафесійнага пеўчага даўгалецця і захавання ўсіх якасных характарыстык голаса.

Асноўныя патрабаванні:

- Нязменнае становішча гартані на ўсім працягу пеўчага працэсу з тэндэнцыяй да паніжанага становішча;
- Стабільнасць і незалежнасць яе функцыянавання ад артыкуляцыйных рухаў ГА;
- Узнікненне імпедансу (роўнасці падскладачнага і надскладачнага ціску – асноўнагй умовы правільнай пастаноўкі голаса).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Засваенне гэтага навыку дазваляе максімальна выявіць асноўныя характарыстыкі пеўчага голасу навучэнцаў: тэмбр, сілу, пазіцыйную вышыню, дыяпазон. Дзякуючы гэтаму, у далейшым можна вызначыць тып голаса, арыентуючыся на тэмбр і характэрныя ноты. У выніку авалодання правільнай арганізацыяй працы гартані ў студэнтаў фарміруюцца навыкі:

- засваення адзінай пеўчай пазіцыі;
- асваення адкрытасці глоткі;
- дасягнення праточнасці ў дыханні;
- утварэння ўстойлівага вібрата;
- Дасягненні акустычнай роўнасці гучання голасу на ўсім дыяпазоне.

Развіццё гэтага навыку ажыццяўляецца апасродкавана – шляхам пастаноўкі канкрэтных вакальна-тэхнічных задач, выкарыстоўваючы метад прасторавых уяўленняў, а таксама патрабаваннем спяваць гукам таго ці іншага характару.

Голас лічыцца добра пастаўленым, калі ён на ўсім працягу дыяпазону афарбоўваецца грудным і галаўным рэзаніраваннем.

Выхаванне навыку адчуванні рэзанатараў перасьледуе асноўную мэту: дасягненне роўнага гучання голасу на ўсім дыяпазоне, г.зн. ліквідацыю рэгістравай няроўнасці. Дзякуючы асваенню гэтага навыку студэнты набываюць уменні:

- арганізацыі максімальнай сабранасці гуку;
- дасягнення добрай палётнасці, г.зн. чутнасці голасу ў вялікіх памяшканнях пры мінімальным выдатку энергіі;
- арганізацыі акругленасці, мяккасці, аб'ёмнасці, паўнаты гучання, грудной і галаўной афарбоўкі голасу;
- знаходжання зручнага пеўчага становішча мовы падчас спеваў.

У выніку засваення студэнтамі гэтых навыкаў рэалізуецца асноўная вакальна-тэхналагічная задача – выхаванне выразнага гучання голасу.

Мастацка-выканальніцкі навык – уменне правільна, з сэнсам, выразна перадаць змест твора, што з'яўляецца адным з асноўных прафесійных патрабаванняў.

Адзінства мастацкага і тэхнічнага развіцця – адзін з асноўных прынцыпаў выхавання спевака. З узрастаннем вакальна-тэхнічнай аснашчанасці, і паступовым ускладненнем сэнсавага і эмацыйнага ўтрымання развіваюцца і навыкі мастацкага выканальніцтва ў студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 План правядзення заняткаў па дысцыпліне

1. Распяванне;

2. Праверка самастойнай работы студэнта (работа над літаратурным і музычным тэкстам);

3. Праверка ведаў студэнтаў тэарэтычнага матэрыялу (жанр песні, гукавыманне, манера выканання);

4. Выпраўленне недахопаў, якія зрабіў студэнт у час выканання вакальнага твора;

5. Работа над тэхнічнымі месцамі ў вакальным творы;

6. Работа над фразіроўкай, нюансіроўкай, выразнымі сродкамі выканання;

7. Разбор новага вакальнага твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.2 Распяванне ў народным хоры

Распяванне хору – вакальна-слыхавая настройка хору, своеасаблівая вакальная гімнастыка, разаграванне і настройка галасавога апарату спевакоў хору на пэўных практыкаваннях. Задача хормайстра пры распяванні хору складаецца ў тым, каб выпрацаваць адзіную вакальную лінію, ансамбль, строй, чысціню інтанацыі, дыханне, высокую пазіцыю гуку.

У распявані можна вылучыць тры групы практыкаванняў:

Першая група. Гэта практыкаванні, якія паўтараюцца пастаянна, з урока ва ўрок. Іх задача – настроіць галасавы і дыхальны апарат на пеўчы рэжым. Паўсядзённыя практыкаванні неабходныя для таго, каб увага співаючых была засяроджана на правільнасці і прыгажосці выканання. Першыя практыкаванні складаюцца з кароткіх фраз, якія не патрабуюць ланцужнога дыхання. Складанасць практыкаванняў і іх дыяпазон ўзрастаюць паступова.

Другая група практыкаванняў накіравана на развіццё розных вакальна-харавых уменняў і навыкаў. Гэта рытмічныя і артыкуляцыйныя практыкаванні, а таксама практыкаванні, накіраваныя на развіццё ланцужнога дыхання, шматгалосныя спеваў і спеваў a cappella.

Трэцяя група практыкаванняў ствараецца кіраўніком для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць пры развучванні таго ці іншага твора. Гэта інтанацыйныя, тесітурныя, рытмічныя цяжкасці.

Распяванне хору перасьледуе, як правіла, некалькі мэтаў:

- Прывіццё хору пэўных якасцяў гуку, якія адказваюць вакальнаму прадстаўленню хормайстра. Сюды варта аднесці такія праблемы вакальнай працы, як дасягненне адзінай манеры гукаўтварэння, дыхання, вакальна-слыхавога ансамбля, манеры спеваў. Пашырэнне дыяпазону хору.
- Падрыхтоўка хору да актыўнай рэпетыцыі і, асабліва, да канцэрту – значная актывізацыя дыхання, артыкуляцыйнай апарата, дасягненне неабходнай свабоды арганізма.
- Вакальная і псіхалагічная настройка хору, дасягненне псіхафізіялагічнай гатоўнасці да вакальна-творчага працэсу.

Рэкамендуецца пачынаць распевание з прымарных гукаў сярэдняга рэгістра, якія патрабуюць мінімуму выдаткаў мышачнай энергіі галасавога апарата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Практыкаванні па развіцці пеўчага дыхання**

Практыкаванні пастаноўкі пеўчага дыхання для пачаткоўцаў:

1. “Задзьмуць свечку”. Гэта практыкаванне на правільнае вакальнае дыханне нацэлена на развіццё дыяфрагмы.

Для выканання прыміце вертыкальнае становішча, а рукі размесціце на баках, накіраваўшы пальцы да пупка. На кожны ўдых звярніце ўвагу, як раскрываецца грудная клетка, а на выдых выпускайце паветра тонкім струменьчыкам, як быццам задзьмуваеце свечку.

2. “Лічылка”. Трэба прыкласці язык да верхніх зубах і зрабіць глыбокі ўдых. Выдыхаючы, не адрываючы языка, старайцеся гучна вымавіць «адзін-два-тры-чатыры».

3. “Сабачка”. Уяўляем, як дыхае сабака і стараемся паўтарыць, здзяйсняючы кароткія ўдыхі-выдыхі.

4. “Доўгі выдых”. Сутнасць гэтага практыкавання для развіцця дыхання – паступова павялічваць час выдыху за кошт глыбіні ўдыху. З часам выдых будзе доўжыцца не менш за хвіліну.

Практыкаванні пастаноўкі пеўчага дыхання для больш вопытных выканаўцаў:

1. Ускладненая “лічылка”. Выконваецца лежачы: язык прыхінаецца да верхніх зубоў, робіцца глыбокі ўдых і на выдыху вядзём лік двухзначных лічбаў (21-22-23-24).

2. Носавы выдых. Набіраем ротам поўныя грудзі паветра, а выдыхаем як мага больш рэзка, каб маментальна вызваліць грудзі.

3. Дыханне на стаката. Для гэтага практыкавання для правільнага дыхання пры спевах вам трэба будзе зрабіць шырокі ўдых, а потым выдыхаць паветра на стаката. Пры гэтым практыкаванні павінны актыўна працаваць мышцы брушнога прэсу, дыяфрагмы і спіны.

4. Вывучыце кароткую хуткамоўку і гучна прамаўляеце яе на адным дыханні.

**Практыкаванні для развіцця артыкуляцыі**

1. Па чарзе ўцягвайце і надзімайце шчокі.
2. Перамяшчайце паветра ўнутры рота «па крузе» з левай шчакі.
3. Стараемся хутка стукаць кончыкам языка па зубах, здзяйсняючы неглыбокія ўдыхі і выдыхі і прамаўляючы «да-да-да».
4. Напаўняем грудзі паветрам, надзімаем шчокі, а затым рэзка выпускаем паветра, адначасова прамаўляючы літару “П”, а потым “Ф”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.3 План анатацыі на вакальны твор

## ПЛАН АНАТАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ

1. Назва твора.

Пашпартныя дадзеныя твора:

· хто ажыццявіў запіс твора;

· дзе і калі запісаны твор;

· хто выканаўца(ы) – Імя, Імя па бацьку, Прозвішча, даты жыцця.

2. Да якога цыклу, або жанру належыць твор (даць кароткую характарыстыку жанра).

3. Агульная характарыстыка твора:

· этнаграфічны рэгіён Беларусі, дзе твор запісаны і бытуе (Паазер'е, Падняпроўе, Усходняе і Заходняе Палессе, Паняманне, Цэнтральная Беларусь) (даць кароткую характарыстыку рэгіёна: стыль выканання, фактура, асаблівасці мелодыкі і г.д.);

· гендэрная і ўзроставая характарыстыка выканаўцаў твора;

· абставіны выканання твора (пара года, тып каляндара, свята, абрад, дата выканання).

4. Этнафанічная характарыстыка твора:

· гукавядзенне (плаўнае, адрывістае, не звязнае, з падкрэсліваннем інш.)

· гукавыманне – акустычныя ўмовы выканання твора: галоснае (на вуліцы), сцішанае (у памяшканні), змешанае, камбініраванае;

· тып інтанавання (сігнальны, рэчытатыўны, маўленчы, вакальны, вакальна-танцавальны);

· рэгістравыя суадносіны пры выкананні твора;

· наяўнасць этнафанічных упрыгожванняў або сродкаў музычнай выразнасці (пазначце якіх менавіта).

5. Музычна-тэарэтычны аналіз твора:

· кароткі змест твора;

· паэтычная структура твора (вызначце від структуры і абазначце яе схематычна);

· дыялектныя асаблівасці твора (да якога дыялекту і тыпа гаворкі належыць твор, даць азначэнне даялектных слоў (растлумачыць) і абазначыць характэрныя ўласцівасці дадзенага даялекту);

· ладава-меладычныя асаблівасці (трыхорд, тэтрахорд, пентатоніка, гексахорд, лады народнай музыкі);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- кароткая характарыстыка меладычнай лініі (лініарная мелодыя або выкарыстоўваюцца скачкі (якія асноўныя), накірункі меладычнай лініі і г.д.);
- структура напева;
- тып фактуры;
- наяўнасць ці адсутнасць акампаніменту. Якія інструменты суправаджаюць твор.

## ПЛАН АНАТАЦЫІ АПРАЦОЎКІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ

1. Назва твора.
   Пашпартныя дадзеныя твора:
   - хто ажыццявіў запіс твора;
   - дзе і калі запісаны твор;
   - хто выканаўца(ы) – Імя Імя па бацьку Прозвішча, дата жыцця.
2. **<u>Кароткія</u>** звесткі аб аўтары апрацоўкі (<u>творчасць</u>, біяграфія).
3. Тып апрацоўкі.
4. Этнафанічная характарыстыка твора:
   - гукавядзенне (плаўнае, адрывістае, не звязна, з падкрэсліваннем інш.)
   - гукавыманне – акустычныя ўмовы выканання твора: галоснае (на вуліцы), сцішанае (у памяшканні), змешанае, камбінiраванае;
   - рэгістравыя суадносіны пры выкананні твора;
   - наяўнасць этнафанічных упрыгожванняў або сродкаў музычнай выразнасці (пазначце якіх менавіта).
5. Музычна-тэарэтычны аналіз твора:
   - кароткі змест твора;
   - паэтычная структура твора (вызначце від структуры і абазначце яе схематычна);
   - ладавыя асаблівасці (танальны план твора);
   - кароткая характарыстыка меладычнай лініі (лініарная мелодыя або выкарыстоўваюцца скачкі (якія асноўныя), накірункі меладычнай лініі і г.д.).
   - тып фактуры;
   - наяўнасць ці адсутнасць акампаніменту. Якія інструменты суправаджаюць твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЛАН АНАТАЦЫІ НА АЎТАРСКІ ТВОР

1. Назва твора.
2. **Кароткія** звесткі аб кампазітары (творчасць, біяграфія).
3. **Кароткія** звесткі аб аўтары тэксту (творчасць, біяграфія).
4. Этнафанічная характарыстыка твора:
   - гукавядзенне (плаўнае, адрывістае, не звязна, з падкрэсліваннем інш.)
   - гукавыманне – акустычныя ўмовы выканання твора: галоснае (на вуліцы), сцішанае (у памяшканні), змешанае, камбінараванае;
   - рэгістравыя суадносіны пры выкананні твора;
5. Музычна-тэарэтычны аналіз твора:
   - паэтычная структура твора (вызначце від структуры і абазначце яе схематычна);
   - ладавыя асаблівасці (танальны план твора);
   - кароткая характарыстыка меладычнай лініі (лініярная мелодыя або выкарыстоўваюцца скачкі (якія асноўныя), накірункі меладычнай лініі і г.д.).
   - тып фактуры;
   - наяўнасць ці адсутнасць акампанементу. Якія інструменты суправаджаюць твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Патрабаванні да экзаменаў і залікаў па дысцыпліне

**1 курс**. На залік або экзамен студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

- два творы невялікага дыяпазону празнага характару і розных жанраў. Адзін а`cappella, другі з суправаджэннем.

**2 курс**. На залік або экзамен студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

- два творы: апрацоўку народнай песьні ці аўтарскі нескладаны твор, які быў напісаны для народнага голасу. Адзін твор выконваецца а`cappella, другі з суправаджэннем.

**3 курс**. На залік або экзамен студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

- два творы: апрацоўку народнай песьні ці неапрацаваную, ці арыгінальны аўтарскі нескладаны твор, які напісаны для народнага голасу. Адзін твор выконваецца а`cappella, другі з суправаджэннем.

**4 курс**. На залік або экзамен студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

- два творы разнастайныя па характару і жанру: апрацоўку народнай песьні ці неапрацаваную шырокага дыяпазону з развітай драматургіяй, ці арыгінальны аўтарскі твор, які напісаны для народнага голасу. Адзін твор выконваецца а`cappella, другі з суправаджэннем.

**5 курс**. На залік або экзамен студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

- тры творы разнастайныя па характару і жанру: апрацоўку народнай песьні ці неапрацаваную шырокага дыяпазону з развітай драматургіяй, арыгінальны аўтарскі твор, які напісаны для народнага голасу. Адзін твор з папярэдніх курсаў. Творы выконваюцца а`cappella і з суправаджэннем.

Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака і кіраўніка фальклорнага калектыву:

- Работа над далейшым развіццём вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў.
- Вывучэнні асаблівасцей народнай манеры спеваў.
- Работа над выбарам рэпертуару для сваёй творчай дзейнасці.
- Удзел у конкурсах і фестывалях.

Форма кантроля – правядзенне тэхнічнага заліка-канцэрта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Пытанні да самастойнай работы студэнтаў

**Першы курс**

**Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры**

1. Авалодванне спеўным дыханнем і яго развіццё.
2. Вызначэнне тыпу і характару голаса.
3. Спевы практыкаванняў на невялікія інтэрвалы.
4. Праца над дыкцыяй пры дапамозе спецыяльных практыкаванняў.

**Форма кантролю**: апытанне студэнтаў на індывідуальных занятках.

**Другі курс**

**Засваенне тэхналогіі спеваў і выканальніцкага майстэрства**

1. Пашырэнне дыяпазона груднога гучання ў межах сэптымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў.
2. Засваенне ўсіх відаў атакі: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай.
3. Плаўнае гукавядзенне з ужываннем розных практыкаванняў.
4. Выкананне вакальных практыкаванняў і папевак больш шырокага дыяпазону.

**Форма кантролю**: апытанне студэнтаў на індывідуальных занятках.

**Трэці курс**

**Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння і метадаў народнага выканальніцтва**

1. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння і метадаў народнага выканальніцтва.
2. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў, набытых на першым і другім курсах.
3. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння.
4. Развіццё навыкаў выканальніцтва неапрацаваных народных песень.

**Форма кантролю**: апытанне студэнтаў на індывідуальных занятках, правядзенне адкрытых экзаменаў і залікаў з апытаннем студэнтаў, накіраваным на выяўленне разумення акрэсленых пытанняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 4.3 Крытэрыі ацэнкі ведаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

1 (адзін) – слабыя музычныя і вакальныя даныя; адсутнасць ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; адмаўленне ад адказу.

2 (два) – слабыя музычныя і вакальныя даныя; дрэнная інтанацыя; слабыя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; адмаўленне ад адказа на большасць пытанняў па дысцыпліне.

3 (тры) – слабыя вакальныя даныя; цьмяны тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; дрэннае валоданне пеўчым дыханнем; слабая апора гуку; няўпэўненае выкананне вакальнага твора; няўменне правільна выконваць дынамічныя адценні; несур`ёзныя адносіны да паэтычнага тэкста, агульнай драматургіі твора; няўмелае валоданне элементамі руху пры раскрыцці сцэнічнага вобраза беларускай народнай песні.

4 (чатыры) – недастаткова поўны аб` ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; пасрэдныя вакальныя даныя; недастаткова яскравы тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; няўменне правільна размяркоўваць пеўчае дыханне; няўстойлівая апора гуку; недастаткова ўпэўненае выкананне вакальнага твора; няўпэўненае выкананне дынамічных адценняў; павярховае разуменне паэтычнага тэкста, агульнай драматургіі вакальнага твора; няўпэўненае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; слабае валоданне элементамі руху пры выкананні народных песень; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

5 (пяць) – некаторыя праблемы галасавога апарата; сярэднія вакальныя даныя; некаторыя недахопы тэмбра голасу; няўстойлівая інтанацыя; пэўныя дэфекты дыкцыі; няўмелае карыстанне ланцужковым дыханнем; недастатковая апора гуку; няўменне прыстасоўваць свій голас да агульнай манеры спеваў; дапушчэнне памылак пры выкананні вакальнага твора; няўпэненае выкананне дынамічных адценняў; недастатковае разуменне паэтычнага тэкста; няўпэненае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; пэўныя цяжкасці валодання элементамі руху пры выкананні народных песень; недастаткова поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

6 (шэсць) – дастаткова поўныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; дастатковыя веды ў аб`ёме вучэбнай праграмы; актыўнасць на практычных занятках; дастатковы ўзровень культуры выканання вакальных твораў, але ж некаторыя праблемы галасавога апарата; пасрэдныя вакальныя даныя; некаторыя недахопы галасавога апарата; пасрэдныя вакальныя даныя; некаторыя недахопы тэмбру голасу; некаторыя дэфекты дыкцыі; недасканалае ўменне прыстасоўваць свій голас да агульнай манеры спеваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некаторыя памылкі пры выкананні вакальнага твора; няўпэўненасць пры выкананні дынамічных адценняў; няўпэўненасць у паразуменні паэтычнага тэкста вакальнага твора; недасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; слабае валоданне элементамі руху пры выкананні народных песень; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

7 (сем) – дастаткова поўныя і сістэматычныя веды ў аб`ёме вучэбнай праграмы; нязначныя праблемы галасавога апарата; недастатковыя вакальныя даныя; нязначныя недахопы тэмбру голасу; інтанацыя з нязначнымі недахопамі; добрая дыкцыя;незначныя памылкі пры ланцужковым дыханні; недахопы пры спевах у ансамблі з другімі харавымі партыямі; недастатковая апора гуку; уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; нязначныя памылкі пры выкананні сваёй партыі пры спевах у ансамблі; выкананне дынамічных адценняў з нязначнымі памылкамі; правільнае разуменне паэтычнага тэкста, агульнай драматургіі вакальнага твора; не зусім дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобразу; нядрэннае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і плясавых песень; не зусім поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

8 (восем) – сістэмныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай прагарамы ў рамках адукацыйнага стандарта; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; граматнае выкананне матэрыялу; здаровы галасавы апарат; добрыя вакальныя даныя; дастаткова яскравы тэмбр голасу; добрая інтанацыя; добрая дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі; дастаткова добрая апора гуку; уменне прыстасоўваць свій голас да агульнай манеры спеваў; упэўненае веданне сваёй партыі пры спевах у ансамблі; уменне валодаць усім дынамічнымі адценнямі; дастаткова правільнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі вакальнага твора; правільнае ўвасабленне сцэнічнага вобразу; добрае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і плясавых песень; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

9 (дзевяць) – сістэмныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай прагарамы ў рамках адукацыйнага стандарта; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; граматнае выкладанне матэрыялу; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; здаровы галасавы апарат; выдатныя вакальныя даныя; яскравы тэмбр голасу; добрая інтанацыя; выразная дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі; добрая апора гуку; уменне прыстасоўваць свій голас да агульнай манеры спеваў; уменне выконваць усе дынамічныя адценні; добрае разуменне паэтычнага тэкста, агульнай драматургіі вакальнага твора;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобразу; свабоднае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і плясавых песень; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

10 (дзесяць) – сістэмныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў рамках адукацыйнага стандарта; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; здаровы галасавы апарат; выдатныя вакальныя даныя; яскравы, прыгожы тэмбр голасу; ідэальная інтанацыя; выразная, без дэфектаў, дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне спяваць у ансамблі з другімі ансамблевымі партыямі; устойлівая апора гуку; уменне прыстасоўваць свій голас да агульнай манеры спеваў; дасканалае веданне сваёй партыі кожнага вакальнага твора; дэталёвае валоданне ўсімі дынамічнымі адценнямі; выдатнае разуменне паэтычнага тэкста, агульнай драматургіі вакальнага твора; свабоднае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і плясавых песень; творчы падыход да стварэння сцэнічнага вобразу; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце.

**Сродкі дыягностыкі**

- Чытанне з ліста вакальных партый;
- Спевы вакальнага твора напамяць;
- Праверка паэтычнага тэкста ў час заняткаў;
- Апытанне (вызначэнне жанра народных песень, асаблівасці вакальнай партытуры, асацыятыўнае ўспрыманне драматургічнай лініі вакальнага твора);
- Выканальніцкіаналіз вакальных партытур;
- Вусны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНА РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тэматычны план курса

| Курсы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | Усяго | Індывідуальныя |
| **Раздзел І. Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры** | | |
| 1. Авалоданне спеўным дыханнем і яго развіццё. | **12** | **12** |
| 2. Набыццё навыкаў спеваў у прымарнай зоне. | | |
| 3. Спевы практыкаванняў на невялікія інтэрвалы. | **6** | **6** |
| 4. Праца над дыкцыяй. | **6** | **6** |
| 5. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. | **10** | **10** |
| 6. Праца над адзінай манерай спеваў. | **6** | **6** |
| | **6** | **6** |
| **Раздзел ІІ. Засваенне тэхналогіі спеваў і выканальніцкага майстэрства** | | |
| 1. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў, набытых на першым курсе. | **4** | **4** |
| 2. Пашырэнне дыяпазона груднога гучання ў межах септымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў. | **6** | **6** |
| 3. Засваенне ўсіх відаў атакі: маккай, цвёрдай, прыдыхальнай. | **6** | **6** |
| 4. Праца над тэхнікай дыхання. | **6** | **6** |
| 5. Удасканальванне плаўнага гукавядзення. | **10** | **10** |
| **Раздзел ІІІ. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаутварання** | | |
| 1. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў. | **6** | **6** |
| 2. Знаёмства з асаблівасцямі дыялекту. | **5** | **5** |
| 3. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварання. | **8** | **8** |
| 4. Знаёмства с метадамі імправізацыйнага выканальніцтва. | **10** | **10** |
| 5. Развіццё навыкаў выканальніцтва неапрацаваных народных песень. | **5** | **5** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел IV. Развіццё і ўдасканальванне вакальнай тэхнікі** | | |
| 1. Пашырэнне дыяпазону голасу спевака. | **6** | **6** |
| 2. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу. | **6** | **6** |
| 3. Ужыванне складаных практыкаванняў для выпрацоўкі рухомасці, гібкасці, і палётннасці голасу. | **6** | **6** |
| 4. Самастойная праца над рэпертуарам. | **4** | **4** |
| 5. Авалодванне навыкамі імправізацыі і самастойнай рэжысуры народнай песні. | **4** | **4** |
| **Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака і кіраўніка фальклорнага калектыву** | | |
| 1. Фарміраванне творчай асобы спевака ў рамках ВНУ. | **4** | **4** |
| 2. Удасканаленне і далейшае развіццё вакальна-тэхнічных навыкаў і уменняў, пошук свайго вакальніцкага крэда. | **4** | **4** |
| 3. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалодванне ваканальніцкім майстэрствам. | **4** | **4** |
| Усяго: | **150** | **150** |

| Курсы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | Усяго | Індывідуальныя |
| **Раздзел 1. Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры** | | |
| 1. Авалоданне спеўным дыханнем і яго развіццё. | **2** | **2** |
| 2. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. | **2** | **2** |
| 3. Праца над адзінай манерай спеваў | **2** | **2** |
| **Раздзел 2. Засваенне тэхналогіі спеваў і выканальніцкага майстэрства** | | |
| 1. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў, набытых на першым курсе. | **2** | **2** |
| 2. Пашырэнне дыяпазона груднога гучання ў сежах септымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў. | **2** | **2** |
| 3. Праца над тэхнікай дыхання. | **2** | **2** |
| 4. Удасканальванне плаўнага гукавядзення. | **2** | **2** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел 3. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння** | | |
| 1. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў. | **2** | **2** |
| 2. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння. | **2** | **2** |
| 3. Развіццё навыкаў выканальніцтва неапрацаваных народных песень. | **2** | **2** |
| **Раздзел 4. Развіццё і ўдасканальванне вакальнай тэхнікі** | | |
| 1. Пашырэнне дыяпазону голасу спевака. | **2** | **2** |
| 2. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу. | **2** | **2** |
| 3. Авалодванне навыкамі імправізацыі і самастойнай рэжысуры народнай песні | **2** | **2** |
| **Раздзел 5. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака і кіраўніка фальклорнага калектыву.** | | |
| 5. Фарміраванне творчай асобы спевака ў рамках ВНУ. | **2** | **2** |
| 6. Удасканаленне і далейшае развіццё вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў, пошук свайго выканальніцкага крэда. | **2** | **2** |
| 7. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалодванне выканальніцкім майстэрствам. | **2** | **2** |
| **УСЯГО** | **32** | **32** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Метадычныя рэкамендацыі па авалоданні народнай манерай спеваў

***Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры***

Авалодванне спеўным дыханнем і яго развіццё. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных навучэнца, творчай схільнасці да таго ці іншага жанру.

Набыццё навыкаў спеваў у прымарнай зоне. Спевы практыкаванняў на невялікія інтэрвалы. Выпрацоўка навыкаў спеваў у народнай манеры ў межах квінты, сэксты, септымы для жаночых галасоў, у межах септымы, актавы для мужчынскіх галасоў.

Праца над дыкцыяй пры дапамозе спецыяльных практыкаванняў. Эканомная артыкуляцыя, натуральнае вымаўленне слоў.

Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. Вымаўленне індывідуальных недахопаў і шляхоў іх пераадолення. Замацаванне песеннай установкі і развіццё спеўных навыкаў, вызваленне песеннага апарата ад напружанасці, ліквідацыя дэфектаў гукаўтварэння, дакладная перадача мелодыі (рытму, гукавысотнасці, фразіроўкі).

У праграму першага курса ўваходзяць 3-4 народныя песні для сольнага выканання з невялікім дыяпазонам рознага характару і розных жанраў. Для вакальнага ансамбля прапануецца вывучэнне 3-4 твораў з суправаджэннем і без суправаджэння. На экзамене ў першым семестры выконваюцца 2 песні: a`cappellai з суправаджэннем, у другім семестры на экзамене выконваюцца 2 рознахарактарныя народныя песні ў сольным выкананні і з ансамблем.

***Засваенне тэхналогіі спеваў і выканальніцкага майстэрства***

Замацаванне і паглыбленне набытых навыкаў. Пашырэнне дыяпазона груднога гучання ў межах септымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужскіх галасоў. Засваенне ўсіх відаў атакі: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над тэхнікай дыхання: апорай дыхання і апорай гуку. Знаёмства з разнастайнымі методыкамі паляпшэння спеўнага дыхання і іх апрабіранне.

Удасканальванне плаўнага гукавядзення з ужываннем розных практыкаванняў. Выкананне вакальных практыкаванняў і папевак больш шырокага дыяпазону. Авалодванне навыкамі спеваў невялікіх скачкоў, папевак у розных тэмпах і больш складаных спалучэннях гукаў.

Вучэбная праграма складаецца з 3-4 твораў: апрацовак народных песень і аўтарскіх нескладаных твораў, напісаных для народнага голасу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Засванне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння і метадаў народнага выканальніцтва***

Удасканальванне і паглыбленне набытых навыкаў. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння і метадаў навучання народнага выканальніцтва. Замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў, набытых на першым і другім курсах. Знаёмства з асаблівасцямі дыялекту. Вывучэнне спецыфікі вымаўлення і манеры выканання на прыкладах рэгіянальных неапрацаваных народных песень.

Знаёмства з метадамі імправізацыйнага выканальніцтва на прыкладзе фальклорнага матэрыялу. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння; расцягванні слоў на дадатковыя галосныя, паўторнасць складоў, арнаментыкі: слізганняў, прыгукаў, народных мелізмаў і мардэнтаў, глісандзіруючых гукаў, спадаў, абрываў складоў і інш. Развіццё навыкаў выканальніцтва неапрацаваных народных песень.

Праграма прадугледжвае развучванне 3-4 твораў: апрацовак і неапрацаваных народных песень, арыгінальных аўтарскіх нескладаных твораў, напісаных для народнага голасу.

***Развіццё і ўдасканальванне вакальнай тэхнікі***

Далейшая праца над развіццём вакальнай тэхнікі. Пашырэнне дыяпазону голасу спевака пры дапамозе спецыяльных больш складаных практыкаванняў. Выпрацоўка навыкаў спеваў на рiaпaі тэхніцы філіроўкі гуку. Выкарыстанне прыёмаў “акруглення” гуку. Развіццё гібкасці, рухомасці і палётнасці голасу. Ужыванне складаных практыкаванняў для ўдасканальвання вакальнай тэхнікі.

Студэнту прапануюцца заданні для самастойнага падбора рэпертуару і рэжысуры народнай песні. Творчы падыход да выканання народнай песні, выяўленне ў студэнта здольнасці да імправізацыі і раскрыцця мастацкага вобраза выконваемага твору.

Праграма, якая выносіцца на экзамен павінна быць разнастайнай па характару і жанрам: 3-4 творы. Абавязкова аўтарская песня і народная песня шырокага дыяпазону з развітай драматургіяй.

***Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака і кіраўніка фальклорнага калектыву***

Праца па фарміраванню творчай асобы спевака і кіраўніка фальклорнага калектыву ў рамках ВНУ. Удасканаленне і далейшае развіццё вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў, пошук свайго выканальніцкага крэда. Перад студэнтам ставяцца наступныя задачы: праяўленне тонкай музыкальнасці і мастацкага густу ў выкананні народнай песні, метадычна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэарэтычная дасвадчанасць у вывучэнні асаблівасцей народнай манеры спеваў, пісьменная арыентаванасць у выбары рэпертуару. Выкарыстанне ў творчай дзейнасці разнастайнага музыкальна-стылістычнага матэрыяла.

Удасканальванне выканальніцкага майстэрства студэнта. Актыўная канцэртнай дзейнасці. Удзел у конкурсах і фестывалях.

Вучэбны рэпертуар пятага курса складаецца з 3 твораў: апрацоўка беларускай народнай песні, традыцыйная рэгіянальная песня і аўтарскі твор.

“Пастаноўка голасу” з’яўляецца галоўнай прафілюючай дысцыплінай, мэта якой – авалоданне вакальна-тэхнічнымі навыкамі і ўменнямі, выяўленне і перадача музычнага і тэматычнага зместу беларускай народнай песні і аўтарскіх твораў, напісаных для народнага голасу. Навучанне прадужледжвае набыццё неабходных ведаў, якія дапамогуць выканаўцу авалодаць сваёй прафесіяй. Курс складаецца з практычнай і тэарэтычнай частак. Выкладчык павінен даць студэнтам тэарэтычныя веды аб рабоцегаласавога апарату, прафілактыцы і абароне голасу, аб прынцыпах падбору рэпертуару з улікам індывідуальных асаблівасцей спевака, пазнаёміць з метадычнымі ўстаноўкамі пры навучанні народнай манеры спеваў. Практычнае авалоданне асаблівасцямі народна-песеннага выканаўства спалучае працяглую работу над развіццём і ўдасканаленнем вакальнай тэхнікі і акцёрскага майстэрства з творчым падыходам да раскрыцця мастацкага вобразу. Асаблівая ўвага ў навучанні звяртаецца на спосаб гукавядзення, рэгіянальныя гаворкі, выканальніцкія прыёмы (гульня словам і гукам у народных выканаўцаў, спосабы перадачы мелізмаў, гукавых скатаў на заканчэнні фраз, агласоўка зычных і інш.), сродкі выразнасці (інтанацыйныя, тэмбравыя, дынамічныя).

Народна-песенная выканальніцкая школа садзейнічае:

– развіццё артыстычных даных праз разуменне драматургіі народнай песні;
– выхаванню музычна-выканальніцкага і мастацкага густу на лепшых узорах нарожнай і аматарскай творчасці і на падставе вывучэння вопыту выдатных майстроў народных спеваў, спевакоў акадэмічнай школы;
– вывучэнню тэхнікі спеваў (пастаноўка голасу і вакальны ансамбль разглядаюцца як сродак для ажыццяўлення мэты, дзе вакальная праца накіравана на прастату, натуральнасць і характарнасць спеваў, інструментальную роўнасць гучання голасу, выхоўваецца размоўная манера вымаўлення), натуральнаму, выразна-асэнсаванаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вымаўленню праз інтанацыйна-сэнсавы пасыл, які раскрывае змест твора.

Увесь працэс навучання накіраваны на развіццё творчага мыслення і беражлівых адносін да народнай песні. Разам з тым рашэнне вакальна-тэхнічных задач павінна ажыццяўляцца і суправаджацца бесперапынным назапашваннем слыхавога ўяўлення, якое фарміруе гукавы вобраз народнага твора. Сучасны выканаўца народнай песні павінен быць рознабакова адукаваным чалавекам, які глыбока разумее фальклор і працэс развіцця народнага выканальніцкага стылю. Прафесійны выканаўца народнай песні абавязаны мець вялікі запас выразных сродкаў і тэхнічных магчымасцей, ён павінен свядома карыстацца сродкамі музычна-паэтычнага ўвасаблення народна-песенных традыцый і народнага вакальнага майстэрства.

Выкладчыкі па пастаноўцы голасу і вакальным ансамблі нярэдка адчуваюць недахоп метадычнай літаратуры па пастаноўцы народнага голасу, а таксама цяжкасці ў падборы вучэбнага песеннага матэрыялу. У сувязі з гэтым мэтазгодным будзе выкарыстанне розных вучэбных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.3 Асноўная літаратура**


1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн: Універсітэтскае, 1989. –с.128-320
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д.Ліцвінка, Г.Д.Кутырова. – Мн: Універсітэтскае, 1995. – с.100-250
3. *Варфаламеева*, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева. – Мн: Бел. Навука, 1980. – 220 с.
4. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс у Раговіча. – Мн: Навука і тэхніка, 1988. – с.320–432
5. *Жніўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн: Навука і тэхніка, 1974. – с.120–340
6. *Мажэйка*, З Я Песні Беларускага Паазер'я / З.Я.Мажэйка. – Мн: Навука і тэхніка, 1981. – с.80- 120; с.300-480
7. *Мажэйка,* З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я.Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. навука,1999. – 276 с.
8. *Можейко* ,З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов.композитор, 1983. – Вып 1. – 184 с.
9. *Можейко*, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. Композитор, 1984. – Вып.2. – 181 с.
10. *Можейко*, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья. Село Тонеж. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.
11. *Эвальд* З.В. Песни Белорусского Полесья. – М.: Сов.композитор, 1979. – 120 с.


**5.4 Вучэбна-метадычная**


1. Грамовіч, І.М. Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый/ І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў.2009.-139с.

2. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б.Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.

*3. Калугина*, Н.В Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. Вузов / Н.В. Калугина, - М.: Музыка,1977. – 71с.

*4. Малышева,* Н.М. О пении / Н.М.Малышева. – М.: Сов. Композитор, 1988. – 135с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.Мешко, Н.К. Искусство народного пения: практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – 80 с.
*6.Менабени*, А.Г. Методика обучения сольному пению: Учебное пособие для пед. ин-тов. – М.: Просвещение, 1987. – 93с.
*7.Огороднов*, Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле. – Киев: Муз Украина, 1980. – 66с.

## 5.5 Дадатковая літаратура

1. *Крывіцкі,* А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / Т-ва па распаўсюджванні паліт. І навук. ведаў БССР. – Мн.,1961. – 40 с.
2.*Несцяровіч, Г.Д., Холупава, Л.І., Дубавец. А.І.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб.дапам./ Г.Д. Несцяровіч,Л.І. Холупава, А.І. Дубавец. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 152 с.
3.*Холупава, Л.*І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль:вучэб.дапам. / Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – с. 50–187

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ